**УДК 340.000.93(476)**

# ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ ЛІБЕРАЛЬНАЙ ДУМКІ НА БЕЛАРУСІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

***д-р гіст. навук, праф. І.А. БАСЮК***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы)***

*Даследуецца ліберальны кірунак палітычнай і прававой думкі на беларускіх землях у XIX стагоддзі. Разглядаюцца два перыяды развіцця ліберальнай думкі ў Беларусі – дарэформавы (да 1861 г.) і парэформавы (1861 – пачатак XX ст.). Аналізуюцца ліберальныя ідэі ўдзельнікаў тайных студэнцкіх арганізацый Віленскага ўніверсітэта філаматаў і філарэтаў, а таксама прафесараў універсітэта Андрэя і Яна Снядэцкіх, Іяхіма Лялевеля, Ігната Даніловіча. Разглядаюцца праект мясцовых рэформ Гродзенскага губернскага правадыра дваранства Віктара Старжынскага, які прадугледжваў нацыянальна-культурную аўтаномію беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі, а таксама ліберальныя ідэі беларускай інтэлігенцыі, якія групаваліся вакол газеты "Менскі лісток". Аналізуюцца палітычныя і прававыя ідэі Уладзіміра Спасовіча, яго разуменне катэгорыі справядлівасці, прынцыпаў правасуддзя, ролі адвакатаў (прысяжных павераных) у судовым працэсе.*

Вывучэнне і асмысленне лібералізму, як ідэйнай і сацыяльна-палітычнай плыні грамадскай думкі і практыкі, уяўляецца актуальнай, бо ідэйна-палітычныя ўстаноўкі лібералізму пакладзены ў аснову дзейнасці сучасных палітычных партый ліберальна-дэмакратычнай накіраванасці. Ліберальныя партыі ў Германіі, Італіі, Фінляндыі, Даніі, Бразіліі, Швейцарыі і іншых краінах прадстаўлены ва ўрадах, у Еўрапарламенце, у Дзяржаўнай Думе Расійскай Федэрацыі. У 1947 годзе ў Лондане быў утвораны Ліберальны Інтэрнацыянал, у які ўвайшлі палітычныя партыі з краін Еўропы, Амерыкі і Азіі.

У часы СССР лібералізм як грамадская з'ява амаль не вывучаўся, бо ацэньваўся як "буржуазная ідэалагічная і грамадска-палітычная плынь" [1]. Адносіны да вывучэння праблем лібералізму змяніліся з другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў, з пераходам Расіі і Беларусі да шматпартыйнасці, адкрытасці, плюралізму. З гэтага часу ў навуковой і публіцыстычнай літаратуры з'явіліся грунтоўныя матэрыялы, прысвечаныя розным аспектам тэорыі і гісторыі лібералізму. У Беларускай энцыклапедыі, Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, у іншых энцыклапедычных выданнях, у вучэбных дапаможніках для студэнтаў, у газетах і часопісах змешчаны матэрыялы, у якіх з новых пазіцый, у кантэксце еўрапейскіх падыходаў разгледжаны аспекты тэорыі і практыкі лібералізму як ідэйнай і сацыяльна-палітычнай плыні. З 1994 года ў Беларусі дзейнічае Ліберальна-дэмакратычная партыя, сацыяльнай базай якой з'яўляюцца высокакваліфікаваныя рабочыя, частка сялянства, прадстаўнікі дзелавых колаў, інтэлігенцыі, студэнцтва.

Разам з тым шмат якія праблемы гісторыі станаўлення і развіцця ліберальнага напрамку палітычнай і прававой думкі на Беларусі даследаваны слаба, асобныя аспекты гэтай праблемы – толькі фрагментарна, да якіх, на наш погляд, можна аднесці вытокі ліберальных ідэй на беларускіх землях, ліберальная думка ў Віленскім універсітэце, сярод беларускай творчай інтэлігенцыі XIX – пачатку XX стагоддзя.

Мэта працы – у нейкай меры запоўніць існуючыя прабелы, раскрыць некаторыя аспекты ўзнікнення і развіцця на Беларусі ліберальных ідэй як напрамку станаўлення айчыннай палітычнай і прававой думкі.

Крыніцы нашага даследавання – дакументы таго часу, мемуарная, манаграфічная, энцыклапедычная, публіцыстычная, вучэбная і іншая літаратура.

**Асноўная частка.** Пад паняццем лібералізм (ад лац. liberalis – свабодны) звычайна разумеецца ідэйная і сацыяльна-палітычная плынь, якая заснавана на прызнанні асобы, яе свабоды і самарэалізацыі найвышэйшай каштоўнасцю і ўмовай развіцця грамадства. Тэрмін «лібералізм» увайшоў у навуковы ўжытак у 1830–1840-я гады, калі ў Заходняй Еўропе ўзніклі палітычныя партыі лібералаў. Заснавальнікамі класічнага лібералізму былі: Дж. Лок, Адам Сміт (Вялікабрытанія); Мантаск'ё, Ф. Гізо (Францыя); І. Кант (Германія); Т. Джэферсан, Б. Франклін (ЗША), А.М. Радзішчаў (Расія).

Ліберальная думка на Беларусі пачала складвацца з канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя і прайшла ў сваім развіцці два адметныя перыяды:

- першы перыяд – дарэформенны (да адмены прыгоннага права ў 1861 годзе);
- другі перыяд – паслярэформенны (1861 год – пачатак XX стагоддзя).

Разгледзім дарэформенны перыяд развіцця ліберальнага напрамку палітычнай і прававой думкі на Беларусі. У гэты перыяд асноўным асяродкам ліберальнай думкі быў Віленскі ўніверсітэт, у якім у 1801 годзе навучаліся 256 студэнтаў (шляхціцаў – 167, мяшчан – 79, разначынцаў – 10 чалавек) [2]. Прыхільнікамі лібералізму былі некаторыя выкладчыкі ўніверсітэта, пад ідэйным уплывам якіх ва ўніверсітэце ўзніклі тайныя студэнцкія арганізацыі філаматаў і філарэтаў.

Філаматы (ад грэч. philomathes – аматар ведаў) – тайнае студэнцкае таварыства, якое існавала ў Віленскім універсітэце ў 1817 – 1823 гадах. Таварыства заснавалі студэнты Восіп Ежоўскі, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка і іншыя (12 чалавек), прэзідэнтам філаматаў быў абраны Восіп Ежоўскі.

У ідэйным развіцці філаматаў можна вылучыць два этапы:

- *першы этап – з 1817 па 1818 год*. На гэтым этапе пераважалі культурна-асветніцкія задачы навуковага і маральнага ўдасканалення. Філаматы пасля ўніверсітэта выказвалі жаданне працаваць настаўнікамі, выхоўваць моладзь у духу польскай культуры [3];

- *другі этап займае час з 1818 па 1823 год*. На гэтым этапе ў філаматаў з'яўляюцца палітычныя ідэі, асабліва з паяўленнем арганізацыі «прамяністых». У 1820 годзе філамат Тамаш Зан з дазволу кіраўніцтва Віленскага ўніверсітэта стварыў легальную студэнцкую культурна-асветніцкую арганізацыю пад назвай «прамяністыя» (выпраменьваць дабратворныя ідэі). Членамі «прамяністых» сталі каля 200 чалавек. Масавасць напалохала кіраўніцтва ўніверсітэта, і ў тым жа 1820 годзе «прамяністыя» загадам зверху былі распушчаны. Тады «прамяністыя» з легальнай пераўтварыліся ў тайную арганізацыю, пад назвай філарэты (ад грэч. philaretos – аматар дабрадзейнасці). "Задачы будучага таварыства вельмі шырокія, – адзначаў Ян Чачот. – Пры дапамозе асветы і згуртавання суайчыннікаў яно павінна рабіць дзейны ўплыў на грамадскую думку, рабіць усё для шчасця і вызвалення айчыны" [4].

Філарэты дзейнічалі як філіял арганізацыі філаматаў, іх прэзідэнтам стаў Тамаш Зан. Філаматы арганізацыйна падзяляліся на секцыі, кожная секцыя падзялялася на групы.

У аснову светапогляду філаматаў і філарэтаў была пакладзена катэгорыя свабоды. Спярша філаматы ўяўлялі свабоду як магчымасць удасканалення асобы ў галіне маралі і навукі. Затым катэгорыя «свабоды» набывае ў філаматаў больш акрэслены змест: свабода процістаўляецца ўсякім сацыяльным перашкодам – дэспатызму, гвалту, прыгнёту і г.д. У праграме філаматаў было запісана: «Пакуль не будзе знішчана ганебнейшая... перашкода – няволя сялян, праціўная натуральнаму праву, цвярозаму розуму, нельга гаварыць аб грамадскім прагрэсе» [5]. Ідэалам філаматаў становіцца асоба свабодная, рашучая, якая змагаецца са злом і прыгнётам.

Пастулова склалася сацыяльна-палітычная праграма філаматаў:

- дэспатызм (самадзяржаўе) філаматы лічылі галоўнай перашкодай у развіцці грамадства, таму выступалі супраць самадзяржаўя і за ўвядзенне канстытуцыі;

- шчаслівую будучыню Беларусі яны звязвалі з радыкальнымі рэформамі, скіраванымі на ліквідацыю прыгоннага права, стварэнне сістэмы народнай адукацыі і інш.

Філаматы ставілі на мэце «вырваць уладу з рук дэспата», разам з тым яны не ўяўлялі, якім чынам гэта ажыццявіць, таму выступалі за адраджэнне Рэчы Паспалітай, за росквіт шляхты, якую яны лічылі сярэднім класам на Беларусі.

Дух і жыццёвую сілу першых тайных студэнцкіх арганізацый добра перадае верш Адама Міцкевіча «Песнь филаретов» (1820 г.):

Эй, больше в жизни жара
Живём один лишь раз:
Пусть золотая чара
Недаром манит нас.
К чему тут речь чужая?
Ведь польский пьем мы мёд.
Нас всех дружней сближает
Песнь, что поет народ.
Вот там юристы сели.
И им бокал поставь:
Сегодня – право силы,
А завтра – сила прав [6].

Звернем увагу на апошнія два радкі верша:

«Сегодня – право силы,
А завтра – сила прав».

Магчыма, Адам Міцкевіч хацеў гэтымі радкамі выказаць такую думку: «Сёння права сілы (самадзяржаўе), а заўтра сіла права (канстытуцыя)».

У 1823 годзе на класнай дошцы ў Віленскім універсітэце з'явіўся надпіс: «Няхай жыве Канстытуцыя 3 мая». Гэта быў заклік да адраджэння Рэчы Паспалітай і яе Канстытуцыі 1791 года. Улады пачалі расследаванне, у ходзе якога выкрылі філаматаў і філарэтаў. У тым жа 1823 годзе арганізацыі філаматаў і філарэтаў былі забаронены, пачалося следства, якое працягвалася 11 месяцаў. У маі 1823 года быў аб'яўлены прыгавор, падпісаны Аляксандрам I, у якім гаварылася, што «за распространение безрассудного польского национализма посредством науки» 9 філарэтаў і 11 філаматаў (Зан, Чачот, Міцкевіч, Дамейка і інш.)

высылаліся ва ўнутраныя губерні Расіі, іншыя былі аддадзены ў салдаты. У 1832 годзе царскі ўрад закрыў Віленскі ўніверсітэт, які больш 30 гадоў быў асяродкам ліберальнай думкі на Беларусі.

Адзначым, што некаторыя былыя філаматы і філарэты сталі вядомымі навукоўцамі і паэтамі: А. Кавалеўскі быў рэктарам Казанскага ўніверсітэта; Дамейка эмігрыраваў у Чылі, займаў пасаду рэктара ўніверсітэта ў Сант'яга; Чачот пасля 10-гадовай ссылкі, вярнуўся ў Шчорсы, дзе да канца жыцця вёў навуковую работу ў бібліятэцы Храптовіча, Адам Міцкевіч стаў знакамітым паэтам і г.д.

Да ліберальнага накірунку належалі браты Снядэцкія (Андрэй і Ян), гісторык Іяхім Лялевель і іншыя. *Андрэй Снядэцкі* (1768–1838) нарадзіўся ў Польшчы, больш 40 гадоў працаваў у Вільні, прафесар медыцыны, аўтар навуковых прац па хіміі і біялогіі. Снядэцкі лічыў, што сацыяльныя ўмовы з'яўляюцца галоўнымі ўмовамі фарміравання асобы. Творчая праца – дабро, яна спрые развіццю асобы; праца ва ўмовах рабства, прыгнёту з'яўляецца няшчасцем для чалавека. Сацыяльныя супярэчнасці Снядэцкі звязваў з неадукаванасцю грамадства, выйсце бачыў ва ўвядзенні ўсеагульнай адукацыі. Андрэй Снядэцкі быў рэдактарам газеты «Вулічныя навіны», якая з'яўлялася друкаваным органам ліберальна-асветніцкага таварыства «шубраўцаў» (літаральны пераклад – валацугаў, свавольнікаў). Газета заклікала да асветы, роўнасці людзей перад законам, да паляпшэння становішча сялян, востра крытыкавала маральную дэградацыю шляхты. Газета выступала за адраджэнне Літоўска-Польскай канфедэрацыі, у якой Літва будзе мець палітычную аўтаномію. *Ян Снядэцкі* (1756–1830), брат Андрэя Снядэцкага. У 1806–1815 гады займаў пасаду рэктара Віленскага ўніверсітэта, з 1811 года – член-карэспандэнт Пецярбургскай Акадэміі навук, напісаў працы па матэматыцы, астраноміі, геаграфіі. Як член Адукацыйнай камісіі прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы праграмы радыкальнай рэформы сярэдняй і вышэйшай школы на Беларусі на пачатках лібералізму. Шмат увагі Ян Снядэцкі ўдзяляў маральна-этычнаму выхаванню моладзі. "Добрыя норавы павінны прывівацца маладым не толькі праз навучанне, – адзначаў ён, – але і выпрацоўкамі ў іх звычкі да добрых спраў, а таксама праз глыбока ўражальныя вобразы, якія выклікаюць агіду да ўсяго таго, што супярэчыць справядлівасці, ісціне, грамадскаму парадку і годнасці чалавека. У грамадскі парадак уключаюцца таксама і дзяржаўныя законы" [7]. На падставе ліберальных ідэй і падыходаў Снядэцкага складваліся новыя ўніверсітэцкія праграмы, уводзіліся новыя вучэбныя курсы, дзякуючы якім Віленскі ўніверсітэт справядліва параўноўвалі з найбольш вядомымі ўніверсітэтамі Еўропы. Рэктарскую дзейнасць Яна Снядэцкага характарызавала яшчэ адна важная дэталь. Калі раней М. Пачобут і І. Страйноўскі часта імкнуліся прыцягнуць ва ўніверсітэт навукоўцаў з-за мяжы, то Ян Снядэцкі рабіў усё магчымае, каб падрыхтаваць мясцовых вучоных і выкарыстаць іх ва ўніверсітэце. *Іяхім Лялевель* (1786–1861). Нарадзіўся ў Варшаве, з 1821 года працаваў у Віленскім універсітэце, выкладаў усеагульную гісторыю, быў ідэйным настаўнікам філаматаў, карыстаўся высокім аўтарытэтам сярод студэнтаў. Лекцыі Лялевеля па гісторыі высока ацэньваліся студэнтамі і выкладчыкамі ўніверсітэта, бо ў іх адлюстроўваліся не толькі прошлае, але і рысы будучага. Адам Міцкевіч, на той час студэнт Віленскага ўніверсітэта, так пісаў аб лекцыях Лялевеля:

Внимает истину из уст твоих народ,
О том что было, есть, что нас в грядущем ждет [8].

У 1824 годзе, у сувязі з працэсам над філаматамі, Лялевель быў зволены з Віленскага ўніверсітэта. Ён прымаў удзел у паўстанні 1830–1831 гадоў, уваходзіў у склад Часовага ўрада паўстанцаў. Даследчыкі лічаць, што Лялевель быў стваральнікам знакамітага лозунга «За нашу і вашу свабоду!», які выкарыстоўваўся падчас паўстання 1830–1831 гадоў. За ўдзел у паўстанні Лялевель быў завочна асуджаны да смяротнага пакарання, таму быў вымушаны жыць за мяжой; падтрымліваў сувязі з А. Герцэнам, К. Марксам, Ф. Энгельсам. Лялевель выказаў шэраг ідэй па ўдасканаленні грамадскага ладу. Зямля, на яго думку, з'яўляецца агульным набыткам, таму ёю павінны валодаць сяляне-землеўласнікі, прыгоннае права павінна быць скасавана. На погляд Лялевеля, сяляне маглі атрымаць ва ўласнасць зямлю альбо шляхам яе выкупу, альбо праз паўстанне, у выніку якога да ўлады прыйдзе рэвалюцыйны ўрад, які і перадасць зямлю сялянам. Лялевель быў адным з першых гісторыкаў, які высока ацэньваў гісторыю беларускай дзяржаўнасці, ён ставіў Полацк побач з Вялікім Ноўгарадам. Недахопам гістарычных прац Лялевеля было тое, што ён падтрымліваў прэтэнзіі палякаў на беларускія землі, пры гэтым ён спасылаўся на Ягайлу, які быццам абяцаў далучыць іх да Польшчы, а таму яны належалі Польшчы, а не Літве [9]. Даследчыкі лічаць, што погляды Лялевеля склалі падмурак для фарміравання светапогляду рэвалюцыянераў 20 – 60-х гадоў, у тым ліку і Кастуся Каліноўскага.

У першай палове XIX стагоддзя працавалі і іншыя знакамітыя навукоўцы і дзеячы ліберальнага напрамку. Адзначым некаторых з іх. *Ігнат Мікалаевіч Даніловіч* (1787–1843), беларускі гісторык і правазнаўца, з сям'і ўніяцкага святара. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, у якім у 1814–1824 гады выкладаў права. Адзін са складальнікаў праекта Звода мясцовых законаў заходніх губерняў. Упершыню апісаў рукапісныя і друкаваныя паасобнікі Статута ВКЛ, падрыхтаваў першае навуковае выданне Статута ВКЛ 1529 года. У працы «Гістарычны агляд літоўскага заканадаўства» (1837 г.) даў характарыстыку развіцця права на Беларусі і Літве, ён першым спрабаваў высветліць яго крыніцы, сцвярджаў самабытны характар літоўска-беларускага права. У «Скарбніцы грамат...» (т. 1–2, 1860–1862 гг.) апісаў, пераказаў змест і част-

кова апублікаваў каля 2500 розных пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы ад выпісак з твораў Герадота да актаў 1569 года. *Іосіф Бенядзіктавіч Ярашэвіч* (1793–1860), беларускі і польскі гісторык, этнограф і юрыст. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, прафесар права. Напісаў навуковыя працы: «Пра ўплыў хрысціянскай рэлігіі на цывілізацыю славян» (1826 г.); «Вобраз Літвы з пункту гледжання цывілізацыі ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII века» (т. 1–3, 1844–1845 гг.), вывучаў паходжанне плямён, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, фальклор і этнаграфію беларускага насельніцтва. *Тэадор Нарбут* (1784–1864). Нарадзіўся і значную частку жыцця пражыў на Лідчыне, гісторык і археолаг. Аўтар «Гісторыі літоўскага народа» (у 2 тамах, падзеі давёў да 1569 года). Увёў у навуковы ўжытак «Хроніку Быхаўца».

Другі этап развіцця ліберальнай думкі на Беларусі прыходзіцца на паслярэформенны перыяд (1861 г.– пачатак XX ст.). Ён характарызуецца актывізацыяй грамадскага жыцця, у тым ліку палітычнай і прававой думкі, якая была выклікана адменай прыгоннага права, эпохай буржуазных рэформаў.

У 1858 годзе Аляксандр II наведаў Мінск і Вільню, у Вільні цар звярнуўся з прамовай да беларускіх дваран. Прамова Аляксандра II у Вільні падала надзеі на рэформы на Беларусі. У гэты час сярод беларускіх лібералаў быў папулярны верш, у якім былі наступныя радкі:

Уставайце, братцы, да дзела, да дзела!
З поўначы певень залопаў крылом!

Як вядома, певень лопае крылом і спявае на досвітку, на пачатку новага дня. «З поўначы певень залопаў крылом!» азначала, што з поўначы, з Пецярбурга набліжаюцца рэформы, таму беларусам патрэбна не праспаць – «Уставайце, братцы, да дзела, да дзела!».

Лідарам ліберальнага руху стаў гродзенскі губернскі прадвадзіцель дваранства граф Віктар Старжынскі (1826–1882). У 1862 годзе Старжынскі прадставіў Аляксандру II праект мясцовых рэформаў, у якім меліся прапановы стварыць на Беларусі мясцовае самакіраванне, вярнуць Статут ВКЛ 1588 года, адкрыць у Вільні ўніверсітэт і інш.

Такім чынам, праект графа Старжынскага прадугледжваў нацыянальна-культурную аўтаномію беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Вядома, нацыянальна-культурная аўтаномія Беларусі не ўкладвалася ў дзяржаўнае рэчышча расійскага самадзяржаўя, таму праект Старжынскага не мог быць падтрыманы царскім урадам.

З другой паловы XIX стагоддзя ліберальныя ідэі набылі шырокую папулярнасць сярод беларускай інтэлігенцыі, якая пачала гуртавацца вакол друкаваных выданняў; у Мінску гэта была газета «Минский листок», першая прыватная незалежная газета. У гэтае згуртаванне ўваходзілі: гісторык М. Доўнар-Запольскі; публіцысты А. Багдановіч, Д. Бохан; паэт Я. Лучына і іншыя. «Минский листок» выступаў як супраць рэвалюцыі, так і супраць рэакцыі. Газета асуджала «азвярэнне» сялян, якія рабілі падпалы і забойствы, таксама асуджала «нахабства» рабочых, якія выступалі супраць фабрыкантаў. Разам з тым газета заклікала царскі ўрад праяўляць гнуткасць у барацьбе з рэвалюцыяй, пазбягаць неапраўданых жорсткасцяў і парушэнняў правоў чалавека.

Лібералы шукалі кампрамісу з самадзяржаўем, патрабавалі пераўтварэння Расіі ў канстытуцыйна-прадстаўнічую манархію шляхам склікання парламента – земскага сабора з шырокім народным прадстаўніцтвам. «Минский листок» выступаў за памяркоўныя рэформы, у аснову якіх былі б пакладзены меры па падтрымцы сялян і народнай адукацыі: стварыць сялянскі банк, касы ўзаемадапамогі, спажывецкія таварыствы; адкрыць курсы, бібліятэкі, народныя тэатры і музеі [10, с. 141–142]. Нацыянальнае пытанне лібералы спрабавалі вырашыць праз праект дабраахвотнага і раўнапраўнага аб’яднання ўсіх нацый у федэрацыю з пэўнай абласной самастойнасцю.

Сярод юрыстаў найбольш знакамітым прадстаўніком ліберальнай думкі гэтага перыяду быў *Уладзімір Данілавіч Спасовіч* (1826–1906). Спасовіч нарадзіўся на Міншчыне, скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Ён быў прыхільнікам ліберальных поглядаў і праграм. Спасовіч пісаў: «Я за ўсякі прагрэс, але за легальны, за ўсякую эвалюцыю, але не рэвалюцыю, за ўстанаўленне парадку на падставе згоды ўсіх партый на арэне парламенту – без крывапраліцця і забойстваў» [11]. Ліберальные погляды Спасовіч адлюстраваў у сваім падручніку па крымінальным праве (1863 г.), у якім ён асуджаў знявагу чалавечай годнасці асуджаных, прычыненне ім маральных і фізічных мучэнняў. Ён адмоўна ставіўся да цялесных пакаранняў, быў праціўнікам смяротнай кары. На погляд Спасовіча, мэтай пакарання павінна быць не помства, а бяспека грамадства. У барацьбе са злачыннасцю Спасовіч важную ролю адводзіў прававому і маральнаму выхаванню, адстойваў прынцыпы незалежнасці і нязменнасці суддзяў, спаборніцтва на судовым працэсе бакоў, галоснасці судаводства, роўнасці грамадзян перад законам.

Цікавыя разважанні Спасовіч пакінуў аб адвакатах (прысяжных паверанных). Без адваката, на яго думку, немагчыма справядлівае правасуддзе. Адвакат павінен выкарыстаць усе магчымыя законныя сродкі для абароны правоў асобы, якая абвінавачваецца; абарона павінна быць скіравана на адшуканне разам з суддзямі ісціны, але не павінна пераўтварацца толькі ў апраўданне злачынцы.

Спасовіч шмат увагі ўдзяляў вучэнню аб справядлівасці. Справядлівасць Спасовіч разглядаў як аб’ектыўны крытэрый суадносін паміж злачынствам і пакараннем, як ісціну ў судзе.

Найбольш поўна рэалізаваць свае ліберальныя погляды Спасовіч атрымаў магчымасць з пераходам на працу ў адвакатуру (1866 г.) Ён выступаў абаронцам на найбуйнейшых палітычных працэсах таго часу: па гучнай у тыя часы справе Нечаева, на «Працэсе 93-х» (праходзілі народнікі А. Жалябаў, С. Пяроўская, С. Кавалік і іншыя).

Спасовіч пакінуў пасля сябе багатую навуковую спадчыну – у 1913 годзе быў апублікаваны збор яго твораў у 10 тамах. Разам з тым неабходна адзначыць, што погляды, навуковая творчасць і дзейнасць Спасовіча вывучаны слаба, гэтыя навуковыя праблемы яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

**Заключэнне.** Ліберальная думка на Беларусі ў XIX стагоддзі прайшла некалькі адметных этапаў свайго развіцця, але заўсёды яна была скіравана на пошук шляхоў эвалюцыйнага развіцця грамадства і дзяржавы, яна асуджала гвалтоўныя метады захопу ўлады, імкнулася стварыць прававое поле для кампрамісаў паміж палітычнымі партыямі, класамі і сацыяльнымі групамі для годнага жыцця людзей.

Матэрыялы даследавання могуць быць цікавымі для выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, для магістрантаў і аспірантаў, якія вывучаюць гісторыю айчыннай палітычнай і прававой думкі XIX – пачатку XX стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1. Либерализм // Советский энцикл. словарь / гл. ред. А.М. Прохоров. – М.: Сов. Энцикл., 1985. – 706 с.
2. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863): манагр. / В.В. Швед. – Гродна, 2001. – 207 с.
3. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси / А.А. Козел. – Минск: Амалфея, 2004. – 247 с.
4. Чачот, Ян. Пра будучае прызначэнне таварыства філаматаў, пра варыянты яго сённяшняй будовы, пра тое, наколькі адпавядаюць яны нашым мэтам (З прамовы на пасяджэнні таварыства філаматаў 7 мая 1821 г.) / Ян Чачот // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стагоддзі: энцыкл. даведнік. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1995. – С. 640.
5. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). – Минск, 2004. – 266 с.
6. Мицкевич, А. Песнь филаретов / А. Мицкевич // Стихотворения. Поэмы / А. Мицкевич. – М.: Худ. лит., 1979. – С. 30.
7. Снядэцкі, Ян. Прадпісанне, паводле якога павінны знаходзіцца пад публічным і хатнім наглядам вучні Мінскай гімназіі Вінцэсь і Юзаф Тышкевічы / Ян Снядэцкі // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стагоддзі: энцыкл. даведнік. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1995. – С. 638.
8. Мицкевич, А. Иоахиму Лелевелю. На открытие курса по всеобщей истории в Виленском университете, 6 янв. 1822 года / А. Мицкевич // Стихотворения. Поэмы / А. Мицкевич. – М.: Худ. лит., 1979. – С. 40.
9. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапам. / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 126 с.
10. Вішнеўская, І.У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пач. XXI ст.): манагр. / І.У. Вішнўская. – Мінск: Тэсей, 2008.
11. Вішнеўская, І У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапам. / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. –148 с.

*Паступіў 04.04.2014*

## STAGES OF DEVELOPMENT OF LIBERAL THOUGHT IN BELARUS IN XIX CENTURY

***I. BASJUK***

*In article the liberal direction of political and legal thought on the Belarus earths in XIX is investigated century. Two periods of development of liberal thought in Belarus – prereform (till 1861) and 1861 – beginning XX the item are considered. In article liberal ideas of participants of the secret student's organisations of Vilensky university, and as professors of university of Andrey and Yana Snedetsky, by Ioahima Lelevelja, Ignata Danilovicha are analyzed. Are considered the project of local reforms of the Grodno provincial leader of nobility of Victor Starzhinsky which provided a national-cultural autonomy of the Belarus earths as a part of the Russian empire, and as liberal ideas of the Belarus intelligency which were grouped round the newspaper "Minsk leaf". Vladimir Spasovicha's political and legal ideas, its understanding of a category of justice, principles of justice, a role of lawyers (barristers) in litigation are analyzed.*